*Людміла Ражкова*

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ Ў АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАХ

У 1990-х гадах новы віток асэнсавання ў педагогіцы атрымала праблема фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы. Асноўны напрамак даследаванняў магчыма акрэсліць як прыстасаванне распрацаваных паняццяў да канкрэтнага навучальна-выхаваўчага працэсу. Актыўны ўдзел у вырашэнні гэтай праблемы бяруць і беларускія навукоўцы-педагогі: Л.А. Альшэўская (1993), Н.У. Альшэўская (2002), А.А. Грымаць (1994–1996), А.А. Міхневіч (1996), Л.М. Варанецкая (1997), Л.Г. Зайцава (2000). У работах гэтых аўтараў разглядаюцца розныя пытанні фарміравання нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці асобы ў навучальна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню. Такія, як фактары, метады, сродкі фарміравання, працэс інтэрыярызацыі нацыянальных каштоўнасцей. Гэтыя пытанні вырашаюцца як на тэарэтычным, так і практычным узроўнях. Аднак, нягледзячы на шматлікія спробы мэтанакіраванага фарміравання гэтага віду самасвядомасці асобы ў навучальным працэсе агульнаадукацыйных устаноў, застаюцца пытанні, якія патрабуюць вырашэння. Адно з іх – фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў сацыякультурных установах.

Перш за ўсё неабходна разгледзець тэарэтычныя падставы канцэпцыі нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці ў айчыннай і замежнай літаратуры. Варта пазначыць, што літаратура па самасвядомасці і этнічнасці вельмі багатая і разнастайная. Развіццё тэорыі нацыянальнай (этнічнай) самасвядомасці разглядаюць прынамсі ў чатырох кірунках.

Першы кірунак прадстаўляе эвалюцыю канцэпцыі самасвядомасці ў шырокай гістарычнай перспектыве [2; 11]. Закладзенае старажытнагрэчаскімі філосафамі разуменне самасвядомасці як рэфлексіўнага ўзроўню свядомасці і сёння працягвае сваё існаванне ў еўрапейскай культуры. Самасвядомасць разглядаецца як іманентная, ідучая з глыбіні духу ўнутраная актыўнасць суб'екта, як рэфлексія суб'екта, які спазнае самога сябе, “ацэнка чалавекам сваіх ведаў і маральнага аблічча, ідэалаў і матываў паводзін, цэласная ацэнка самога сябе як дзеяча, які мысліць і адчувае” [6, с. 591], а таксама і ўсведамленне ўласных псіхічных уласцівасцей і якасцей, “запатрабаванняў, здольнасцей, схільнасцей, матываў паводзін, перажыванняў і думак” [33, с. 332]. Частка слова “сама” характарызуе зварот свядомасці ўласна на сябе, акцэнтуе каштоўнаснае стаўленне да сябе: аналіз, ацэнку, вывады аб сабе як аб'екце вывучэння.

Другая лінія развіцця канцэпцыі самасвядомасці звязана з азначэннем яе сацыяльнай дэтэрмінацыі. Сацыялагічны аспект самасвядомасці індывіда звязаны з усведамленнем асобай сябе як выканаўцы пэўных сацыяльных роляў ва ўзаемадзеянні людзей, якія аб'яднаны ў розныя сацыяльныя супольнасці з мэтай ажыццяўлення карыснай дзейнасці [1; 7]. Кожны індывід усведамляе сябе ў якасці прадстаўніка таго ці іншага грамадства, той ці іншай сацыяльнай групы, культуры. Асабліва трэба адзначыць дзейнасць школы псіхалагічнай антрапалогіі, якая існавала ў межах гэтага кірунку ў Амерыцы 1930–40 гадоў пад назвай "Культура і асоба" (Р. Бенедыкт, К. Дзюбуа, М. Мід і інш.). Вывучэнне працэсаў сацыялізацыі, інкультурацыі, універсальных і культурна-спецыфічных сродкаў, спосабаў, метадаў уваходжання і засваення індывідам культуры свайго народа пашырылі разуменне сацыяльнага складніка самасвядомасці.

Трэці кірунак у вывучэнні самасвядомасці разгортваецца ў межах замежных тэорый асобы XX стагоддзя, а менавіта вывучэнне самасвядомасці ў структуры Я-канцэпцыі. Агульнае вызначэнне Я-канцэпцыі раскрывае яе як дынамічную сістэму кагнітыўных уяўленняў аб уласным "Я", рэпрэзентатыўных у дачыненні да таго, кім чалавек з'яўляецца. Яна прадстаўляе выніковы прадукт усіх працэсаў самасвядомасці, з дапамогай якіх фарміруецца "вобраз Я". Вывучэнне самасвядомасці ў замежнай тэорыі асобы ўключае тры асноўныя падыходы, якія адрозніваюцца паміж сабою "аксіяматычнымі ўяўленнямі пра чалавечую прыроду", якія маюць дачыненне да свабоды і дэтэрмінацыі псіхічнай самарэгуляцыі ў кагнітыўным, афектыўным і канатыўным аспектах [9]. Асноўныя філасофскія палажэнні, закладзеныя ў аснову тэорый асобы, адрозніваюцца пазіцыямі адносна ступені праяўлення ўнутранай свабоды "Я". Гэтыя палажэнні могуць займаць радыкальныя пазіцыі: сапраўднай свабоды "Я", адказнага за ўласныя дзеянні – тэорыі А. Адлера, А. Маслоу, К. Роджэрса і дэтэрмінісцка арыентаваныя тэорыі асобы З. Фрэйда, Э. Эрыксана, Б. Скінера, дзе праявы "Я" абумоўліваюцца як унутранымі фактарамі: прыроджанымі – генетычным і біялагічным субстратам індывіда, так і набытымі – навучаннем, неўсвядомленымі матывамі, раннім дзіцячым досведам, і знешнімі – умовамі сацыялізацыі і іншымі сацыякультурнымі ўплывамі. Сярэднюю пазіцыю, якая сцвярджае з аднаго боку актыўнасць, волю, асабістую адказнасць, свабоду выбару і самавызначэнне "Я", а з іншага – дэтэрмініруючыя фактары ў адзінстве або ва ўзаемнай дэтэрмінацыі займаюць тэорыі асобы Э. Фрома, Г. Алпорта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У айчыннай псіхалогіі вывучэнне самасвядомасці вызначаецца шэрагам прынцыпаў і метадалагічных падыходаў, якія выяўляюць прыроду і сутнасць дадзенага феномена [10; 12]. Асаблівае значэнне набылі прынцыпы: 1) адзінства свядомасці і дзейнасці (С.Л. Рубінштэйн, А.М. Лявонцьеў, Б.Г. Ананьеў, Б.М. Цяплоў, А.А. Смірноў); 2) прынцып развіцця самасвядомасці (Л.С. Выгоцкі, С.Л. Рубінштэйн, І.М. Сечанаў, Б.Г. Ананьеў, В.С. Мерлін); 3) прынцып гістарызму (Л.С. Выгоцкі, А.Г. Спіркін); 4) прынцып асабістага падыходу (С.Л. Рубінштэйн, К.К. Платонаў, В.С. Мерлін і іншыя); 5) прынцып сістэмнага падыходу да даследавання самасвядомасці, які дазваляе разглядаць яго як цэласную шматкампанентную сістэму (В.С. Мерлін).

Чацвёрты, культурна-этнічны кірунак распрацоўкі тэорыі самасвядомасці звязаны з праяўленнем цікавасці навукоўцаў да этнакультурнай супольнасці – "народа". Яшчэ ў XVIII стагоддзі італьянскі даследчык Дж. Віко сцвярджаў, што толькі "новая навука" праз гістарычны аналіз мовы, міфаў, рытуалаў розных народаў дапаможа спасцігнуць праўдзівую прыроду чалавека. У канцы XIX стагоддзя І. Гердэр, развіваючы гэтую ідэю, паказвае, што народныя традыцыі ствараюць тое арганічнае адзінства, якое надае чалавечым супольнасцям уласцівае ім адчуванне ідэнтычнасці. Вынікам развіцця гэтых ідэй у сучаснай замежнай сацыяльнай навуцы стала разуменне этнічнасці ў трох асноўных кірунках: прымордыялізм, сітуацыянізм, канструктывізм, якія аказалі ў той або іншай ступені ўплыў на айчынную тэорыю этнасу, фарміраванне яе канцэптуальнага апарату.

У цэнтры прымордыялізму (В. Берг, Э. Сміт, К. Гірц і іншыя) знаходзіцца духоўная аснова этнічнасці. "У кожным грамадстве амаль ва ўсе часы некаторая прыхільнасць вынікае з пачуцця натуральнай, духоўнай блізкасці хутчэй, чым з сацыяльнага ўзаемадзеяння," – піша К. Гірц [8, с. 45]. Так Э. Дзюркгейм вылучае здольнасць абраду выклікаць у яго ўдзельнікаў аднолькавы псіхічны стан, які спараджаецца не мэтамі і прычынамі групавога збору, а самім фактам аб'яднання [13]. Таму такія этнакультурныя формы, як абрады, ініцыіруюць глыбокія пачуцці і праз сваю архаічнасць і традыцыйнасць садзейнічаюць усведамленню супольнасці людзей як адзінага цэлага. Прыхільнікі дадзенага падыходу дэкларуюць, што пачуццё, звязанае з этнічнай прыналежнасцю, надзвычай устойлівае, стабільнае і таму дамінантнае ў параўнанні з іншымі эмацыянальнымі перажываннямі. У якасці падстаў этнічнай ідэнтычнасці яны разглядаюць культурныя маркеры, такія, як мова, звычаі, рэлігія і іншыя.

З пункту гледжання сітуацыянізму этнічнасць вызначаецца і выяўляецца ў залежнасці ад сітуацыі. Так, этнічная самасвядомасць можа выяўляцца толькі пры вызначаных умовах, "выклікаецца да жыцця і выкарыстоўваецца ў мэтах сацыяльнай мабілізацыі, пераадолення дамінавання і падначалення, сацыяльнага кантролю, ажыццяўлення ўзаемных паслуг і салідарных паводзін, імкнення да гармоніі і для дасягнення геданістычных памкненняў" [5, с. 6]. Падкрэсліванне сітуацыйнай дэтэрмінацыі этнічнасці дазваляе даследчыкам ставіць пытанні аб умовах, якія актывізуюць або элімінуюць этнічныя з'явы, розных фактараў, якія ў рознай ступені ўдзельнічаюць у стварэнні этнічнасці. У межах гэтага падыходу яна разглядаецца як з'ява гнуткая, якая змяняе свой змест у залежнасці ад змены сацыяльнага асяроддзя.

З пазіцый канструктывізму этнічнасць ёсць артэфакт, штучна сканструяваны або ўяўны. Для паслядоўнікаў гэтага кірунку этнічнасць мае карані не ў "сэрцах", а ў "галовах" этнічных суб'ектаў, "уяўных супольнасцей" або "сацыяльных канструкцый" [4, с. 42]. Людзі самі канструіруюць сваю ідэнтычнасць у залежнасці ад той ці іншай культурнай мадэлі ў працэсе пастаяннай вытворчасці і ўзнаўлення (канструявання) этнічных значэнняў і сэнсаў элементаў культурных сістэм. Этнічнасць у межах канструктывізму з’яўляецца featureнавідавым ўтварэннем з рознымі формамі выяўлення і праяўлення ў залежнасці ад сацыякультурных канструкцый.

Такім чынам, аналіз навуковай літаратуры па праблемах нацыянальнай самасвядомасці дазваляе зрабіць нам высновы аб тым, што нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца адной з форм самасвядомасці чалавека. Яна набывае сваю этнічную афарбоўку тады, калі з'яўляецца асоба, здольная да свядомых адносін да ўласных нацыянальных асаблівасцей і назірання сваіх нацыянальных рыс, што дазваляе ёй ідэнтыфікаваць сябе з іншымі, “сваімі” прадстаўнікамі супольнасці. Нацыянальную самасвядомасць асобы мы разглядаем як духоўнае ўтварэнне; вынік культурнай самаідэнтыфікацыі індывіда, устойлівую сістэму ўсвядомленых уяўленняў і ацэнак этнадыферэнцыруючых і этнаінтэгрыруючых кампанентаў жыццядзейнасці этнасу, якія існуюць у рэчаіснасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Бромлей, Ю.В. Очерки теории этноса / Ю.В. Бромлей. – М. : Наука, 1983. – 412 с.
2. Гарнцев, М.А. Проблема самосознания в западноевропейской философии: (От Аристотеля до Декарта) / М.А. Гарнцев. – М. : Изд-во МГУ, 1987. – 214 с.
3. Психологический словарь / В.В. Давыдов [и др.] ; под общ. ред. В.В. Давыдова. – 2-е изд. перераб. и доп. – М. : Педагогика-пресс, 1997. – 438 с.
4. Солдатова, Г.У. Психология межэтнической напряженности / Г.У. Солдатова. – М. : Смысл, 1998. – 389 с.
5. Тишков, В.А. О феномене этничности / В.А. Тишков // Этногр. обозрение. – 1997. – № 3. – С. 3 – 21.
6. Философский энциклопедический словарь / ред. С.С. Аверинцев [и др.]. – М. : Сов. энцикл., 1989. – 814 с.
7. Хабибуллин, К.Н. Испытания национального самосознания / К.Н. Хабибуллин, Н.Г. Скворцов. – СПб. : Петрополис, 1993. – 120 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Хотинец, В.Ю Этничность в интегральном исследовании индивидуальности человека: методология, теория, эмпирика и педагогическая практика. На материале исследования коренных народов Западного Урала : дис. … д-ра психол. наук : 19.00.01 / В.Ю. Хотинец. – М., 2003. – 415 л.
9. Хьелл, Л. Теории личности: (основные положения, исследования и применение) / Л. Хьелл, Д. Зиглер. – СПб. : Питер Пресс, 1997. – 608 с.
10. Чеснокова, И.И. Проблема самосознания в психологии / И.И. Чеснокова. – М. : Наука, 1977. – 144 с.
11. Шестопал, А.А. Национальное и общечеловеческое в духовной культуре: анализ современных политологических концепций : автореф. дис. … канд. филос. наук : 09.00.11 / А.А. Шестопал ; АН Туркменистана, Ин-т философии и права. – Ашхабад, 1994. – 21 с.
12. Шорохова, Е.В. Проблема «Я» и самосознание / Е.В. Шорохова // Проблемы сознания : матер. симпозиума / Ин-т философии, Акад. наук СССР ; под ред. В.М. Банщикова. – М., 1966. – С. 217 – 227.
13. Durkheim, E. The Elementary Forms of Relegious Life / E. Durkheim. – New-York , London, 1965. – 198 p.

***Лидия Шкор***

## НАЦИОНАЛЬНАЯ ТЕМАТИКА В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ АВТОРОВ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Изучение национального искусства является приоритетным направлением современного белорусского искусствоведения. На рубеже XXI в. в творчестве современных белорусских авторов значительно обновились тематические доминанты. Рассматривая созданные современными белорусскими авторами произведения живописи и музыки сквозь призму компаративного анализа [1], мы можем выявить общие закономерности развития национальной культуры в целом.

Фольклорные традиции не утратили своей актуальности в современном белорусском искусстве. Интонации народных песен, оттеняющие сюжеты о природной красоте родного края, представлены в творчестве В. Кузнецова («Беларускае вяселле»), Г.Ермоченкова («Сказ аб зямлі Палескай»), в обработках народных песен А.Безенсон. Белорусская природа предстает в акварелях С.Домарада (альбом «Живописная Беларусь»), полотнах Г. Ващенко и В. Шматова. Символами национальной гордости стали города и местечки Беларуси, бывшие некогда средоточием исторических, духовных и легендарных событий. Полоцк, Несвиж, Мир, Гольшаны, Крево, Новогрудок, Заславль, – им посвятили свои музыкальные произведения В. Кузнецов, Г.Горелова, А.Литвиновский, Д. Лыбин, В. Дорохин, Г. Ермоченков, Л. Симакович, С. Бельтюков. Эти музыкальные произведения своеобразно перекликаются с образами, запечатленными на полотнах Г. Ващенко, В. Барабанцева, А. Барановского, В. Шаркова. Особенно примечательна у В. Шаркова серия картин под общим названием «Краявіды Беларусі».

Если в белорусском искусстве советского периода понятие «национальный» уравнивалось с понятием «народный», связывалось с обращением к фольклорным пластам, то теперь интерес авторов проявился к ранее «закрытой» тематике, связанной с историей княжеских родов или церковной средой.

Наиболее яркими образами, связанными с национальной историей, для современных белорусских авторов стали фигуры Франциска Скорины и Евфросинии Полоцкой. Свое воплощение в живописи эти образы нашли в картинах Г. Ващенко – «Асветнікі», «Роднае слова», «Нашчадкам», «Айчына», и В. Барабанцева – «Асветнікі», «Евфросиния Полоцкая». В музыкальном искусстве образ Скорины был запечатлен в мистерии А. Литвиновского «Франциск», телеопере Д. Смольского «Франциск Скорина», кантате Э. Носко «Франциск Скорина» и вокально-симфонической поэме «Радуйся, Франциск Скорина», сюите для органа А. Короткиной «Франциск Скорина». А образ Евфросинии оказался особенно близок белорусским женщинам-композиторам – Л. Симакович («Сны Евфросинии»), А. Безенсон («Евфросиния»), Л. Шлег («Песнопения о Евфросинии Полоцкой»). Имена князей и княжон звучат в названиях многих музыкальных произведений белорусских авторов – балет «Страсти (Рогнеда)» А. Мдивани, «Барбара Радзівіл» Е. Поплавского, «Дикая охота короля Стаха» В. Солтана, «Легенда о короле Стахе» А. Короткиной, «Князь Витовт» В. Копытько, балет «Витовт» В. Кузнецова.

В балете «Витовт», созданном В. Кузнецовым в 2013 г., передаются не только сложные исторические события, характеризуется масштаб личности князя, но и раскрывается романтическая линия, смягчающая трагизм образа главного героя. Романтическая линия, намеченная А. Дударевым (по пьесе которого написан балет), подчеркивает элементы фантазийности в историческом сюжете, придает яркость и контрастность всей драматургии балета [2]. История предстает в интересном событийном аспекте, в переплетении трагических линий судьбы князя и судьбы его княжества.

Пробудить национальное самосознание, любовь и уважение к отечественной истории призваны и живописные полотна современных белорусских художников. Так, напримепр, Г. Ващенко написал серию картин, посвященных выдающимся личностям и событиям нашей истории: «Лев Сапега в Гольшанах», «Князь Чародей», «Королева Бонна», «Шляхецкое достоинство», «Возрождение» и другие. Художник ищет такие средства выразительности, которые позволили бы ему донести до зрителя благородство, мужество и внутреннюю красоту наших славных соотечественников. Картины отличаются строгостью рисунка,